# ДЫЯЛОГ РОДНАСНЫХ ДУШ

**Офіс на Савецкай, 31 наведалі гродзенскія студэнты-філолагі.**

Сустрэчы з прадстаўнікамі маладога пакалення для літаратараў Гродзенскай вобласці з'яўляюцца не толькі добрай традыцыяй, але і ўсвядомленай неабходнасцю. Кожны, хто сур'ёзна займаецца мастацтвам, імкнецца зазірнуць у будучыню, будаваць масты з нашым заўтра; цікавіцца – чым жыве сучасны малады грамадзянін Рэспублікі Беларусь, чым характарызуюцца духоўныя памкненні моладзі, якія ў яе каштоўнасці, інтарэсы. Сёння нашу моладзь можна сустрэць на розных літаратурных мерапрыемствах, у ліку ўдзельнікаў эксклюзіўных праектаў ГрАА СПБ – Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы, грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» і іншых. Сярод усіх напрамкаў дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі работа з моладдзю – у прыярытэце. Год таму абласная пісьменніцкая арганізацыя ініцыявала і правяла ў Гродне абласны семінар маладых літаратараў Гродзеншчыны; падзея стала знакавай і дапамагла адкрыць новыя імёны ў айчыннай літаратуры.

Як паказвае практыка, мы таксама з'яўляемся частымі гасцямі розных устаноў адукацыі. З адукаванай, прагрэсіўнай моладдзю ў нас ідэнтычныя задачы – працяг традыцый мастацтва і адукацыі, вывучэнне і развіццё айчыннай культуры, асвета сярод шырокіх мас насельніцтва. Такім чынам, можна казаць пра ўзаемавыгадную, эфектыўную сувязь пакаленняў і светапоглядаў, дыялог родных душ.



Адна з такіх сустрэч днямі адбылася на нашай, пісьменніцкай тэрыторыі. Офіс Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў адным з гістарычных будынкаў цэнтральнай часткі Гродна наведалі студэнты 3 курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія» Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. А з імі – іх выкладчык, наша калега па творчым саюзе, кандыдат філалагічных навук, літаратуразнаўца Аліна Эдмундаўна Сабуць. Аліна Эдмундаўна – вядомы і паважаны ў краіне даследчык мастацкага слова, лаўрэат

Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь, пераможца IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі «Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства». Менавіта наша калега некалькі гадоў таму ініцыявала і ўзяла на сябе рэалізацыю адмысловага праекта, які атрымаў назву «Літаратурныя ўніверсітэты». У яго межах сустрэчы студэнтаў ГрДУ імя Янкі Купалы з членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі адбываюцца рэгулярна. Вынікамі атрыманых падчас сустрэч уражанняў і набытых кампетэнцый становяцца агульныя натхненне, пашырэнне кругагляду, новыя мастацкія творы і новыя даследчыя працы, водгукі на творчасць сучасных мясцовых аўтараў.



У пісьменніцкім офісе перад моладзевай аўдыторыяй выступілі: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса, празаік Людміла Кебіч і член СПБ, паэтэса Людміла Шаўчэнка. Гутарка ішла пра сучасную літаратуру для дзяцей, – даследаваннем гэтага матэрыялу маладыя філолагі займаюцца ў кантэксце вывучэння сучаснай беларускай літаратуры. Людміла Антонаўна прапанавала аўдыторыі змястоўны агляд творчасці дзіцячых пісьменнікаў Гродзеншчыны. Людміла Уладзіміраўна пазнаёміла гасцей з некаторымі старонкамі сваёй біяграфіі, крыніцамі натхнення і асаблівасцямі сваёй паэзіі. У аўтарскім выкананні пісьменніц прагучалі некаторыя мастацкія творы на беларускай і рускай мовах, разнастайныя па жанрах і мастацкіх стылях. Пачутае выклікала ў студэнтаў шчырую зацікаўленасць. Дарэчы, сярод гасцей знайшліся і паэты-пачаткоўцы. Маладымі вучонымі было зададзена мноства пытанняў, на якія пісьменніцы стараліся адказваць шчыра і даходліва, падмацоўваючы свае адказы ўласнымі творамі.



Атмасфера дыялогу была вельмі добразычлівай; выступленні гродзенскіх паэтэс сустракаліся апладысментамі. Найбольш актыўныя ўдзельнікі сустрэчы атрымалі ад гаспадароў падарункі – кнігі з памятнымі аўтографамі аўтараў. Яшчэ адным важкім набыткам сталі каштоўныя веды. А неабходнасць працягваць рэалізацыю праекта «Літаратурныя ўніверсітэты» атрымала чарговае пацверджанне.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** студэнты 3 курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія» Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы падчас сустрэчы з гродзенскімі пісьменніцамі Людмілай Кебіч і Людмілай Шаўчэнка ў межах доўгатэрміновага праекта «Літаратурныя ўніверсітэты» (ініцыятар кандыдат філалагічных навук, член СПБ, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць). Офіс СПБ-Гродна, 4 чэрвеня 2025 года.


Поэзия
2025

